Андрэй Александровіч

# Ш Т А Н Ы

Самыя звычайныя штаны: зрэбныя, саматканыя, у чорны колер пафарбаваныя галіфэ-штаны.

Чаму Янка Крыцкі, пастух калгасу "I-га мая", Лагойскага раёну, пакрыуджаны?

Чаму ён заусёды расказвае пра штаны і гэтак нэрвова,гэтак усхвалявана?

Чаму у яго голасе чуецца абраза, дасада,крыуда?

Вось ужо хутка будзе год, а Янка Крыцкі ня можа сціхамірыцца. Сустрэнься яму на вочы свежы чалавек, ён будзе скардзіцца-расказваць доуга-доуга...Успомніць шлях жыцця свайго. Замілавана з гонарам раскажа пра калгасны статак, што пасьвіць ён з першых дзён стварэння калектыву. Затым...зноу--штаны, самыя звычайныя і такія дарагія.Тут гутарка спыняецца,словы яго застываюць.Гаварыць больш ня можа.Лягла ня ягоныя грудзі крыуда.

А крыудзіцца Янка Крыцкі мае права. Чаму?

Разгаварыліся.Янка нэрвуецца. Ён усхваляваны.Ён зноу прыгадвае сваю бяду-крыуду.Вочы яго, то запальваюцца гневам, то засцілаюцца блакітнай істужкай жніветскага неба. У яго мяккім голасе чуецца жаданне,каб слухалі яго і слухалі да канца:

-- Як вам зьвесна, мяне прэміравалі.Ніводнае кароукі у мяне не прапала.Я сам,як вам зьвесна, батрак.Гол як сокал.Вунь ветрам шытая хатка мая.Бацькоу сваіх,як вам зьвесна,знаць я ня ведаю. З маленства я, у рабоце.Жаніуся я тут ужо, у калгасе.Дзевачка гадавалася, а гэта,як вам зьвесна,жонка мая. Працую-ж я што сіл і сумлення. Хай скажуць гаспадары-калганікі.

Янка акінуў дапытлівым поглядам грамаду,што акружала нас і слухала ягоную крыўду.Некаторыя з прысутных слухалі Янку, хаваючы ў зарасьлях вусоў нядобрую ухмылку.

--На сходзе мне,як вам зьвесна, прэмію абвясьцілі. Я хадзіў было,як вам зьвесна, без штаноў,--яно, канешне, у штанах, але,як вам зьвесна, падзёртыя ушчэнт,так што,выбачайце,відаць было... І вось абвясцілі мне ў прэмію,як вам зьвесна, штаны. А ў калгасе я першы.Я, канешне, можна сказаць,як вам зьвесна, чырвонаармеец быў--і гаварыў я,што калгасы--за савецкую ўласць парційную, лепшаму жыццю дарога.

Яно у нядзельку выходную у Лагойск схадзіць падумаеш,дык як-жа?--быццам у штанах чалавека, а як вам зьвесна, без штаноў.

Што я п"ўука кулацкая? Што я шкадлівец долі мужыцкай?

Я, можна сказаць,як вам зьвесна, пад Перакопам ранены. Вось яна куля белая плячо маё пакрывіла.Я быў і на фронце,як вам зьвесна, з панамі біліся.Але, канешне, знарадам на Бярозе мяне кантузіла.

Цяпер,як вам зьвесна, я у калгасе.Люблю я скаціну. Пасу яе, шукаю траўкі ёй лепшай, сытнейшай.Яно, канешне, патравы ня было ў мяне і, дзе вы бачылі, падзяку. Што-ж вы думаеце?

Мінае месяц, другі, чацьверты, а штаноў,як вам зьвесна, не выдаюць.Ужо і сяляне блізкія пасьмейваюцца:

-- "Што-ж калгаснік Янка, дзе твая прэміроўка калгасная?"

-- Крыўдна мне, да душы крыўдна.

Думаў я у Менск падацца, каб паскардзіцца, але ў чым пайсьці?

Янка апусьціў галаву і кастлявым сваім кулаком стаў церці гатовае зараз прасьлязіцца, вока.

-- Я, канешне, вінаваты.

Як,вам зьвесна я ня курашчы. Што мне? Выдалі па тры пачкі махоркі. А што мне было рабіць? Я пайшоў да аднаасобніка Сідара і, канешне, аддаў яму махорку. Пасьвіў я статак калгасны і седзячы сабе на узьлессі сплёў Сідару тры кошыкі.Дык ён,як вам зьвесна, Сідар, даў мне за махорку і кошыкі гэтыя вось,каб я так жыў, штаны,--і Янка Крыцкі падняў адно,потым другое калена,каб паказаць чорныя кужэльныя галіфэ-штаны з пацёртымі шэрымі латамі.

Вочы яго загарэліся жаданнем пачуць таварыскую падтрымку, пачуць адказ-спачуванне яго крыўдзе, пачуць цёплае слова згоды на права абурэння.

Яму было цяжка гаварыць і таму,што хваляваўся і, галоўнае, фізычна цяжка гаварыць --па хваробе, сьдед кантузіі.

Некаторыя бравыя малойчыкі, што парой падтруньвалі над Янкам, імкнуліся і цяпер абярнуць ягоную скаргу ў жарт, але ўбачыўшы, што мы жартаваць ня збіраемся, адсоўваліся памаленьку ўзад.

Чалавеку трэба выдаць штаны.Не выдаюць.Прымушаюць яго - калгасніка пайсці і схіліцца аднаасобніку і за махорку і за спэцыяльна сплеценыя кошыкі выпрасіць штаны. Добрыя жарты!

-- Яно праўда,што нейк часамі не па-людзку ў нас абыходзяцца з людзьмі,--падаў свой голас калгаснік з чорнай і даўгой,як паранджа, барадой.

-- Янр ў калгасе "Зорка",дык там Лявону--вартаўніку калгаснаму, прэміроўку далі, ведаеце, шлейкі для штаноў. Глянуў

стары і ледзь не заплакау. А пасьля прамяняу у камсамольца Пётры на капшук з люлькаю.

-- Як вам зьвесна,я -- чалавек! -- Ня устрымауся і ярасна і гнеуна крыкнуу Янка Крыцкі.

Адчуваючы сябе дужа нялоука, зразумеушы,што справа са штанамі перарасла у палітыку, старшыня калгасу,чухаючы пецярнёй патыліцу, нешта шукае такое, што было-б прычынаю нявыдачы штаноу.

Калгас "I мая" не малады. У калгасьніка ёсць і хлеб і скварка, і сарочка, і рубель. Выпадак з Янкам Крыцкім мы абнародваем,як факт бяздушша, нячуласьці, нявагі.

Газета "Звязда" ад 29 верасня 1932 г. № 218 /4470/